27. *Bagińska, E.* Instrukcje dotyczące organizacji życia religijnego w dobrach kanclerza litewskiego Ostafiego Wołłowicza w drugiej połowie XVI wieku / E. Bagińska // Biuletyn Historii Pogranicza. – Bialystock. – 2012. – № 12. – S. 5–14.

28. *Андрэева, Е. Г.* Пратэстанцкая адукацыя: этнічны аспект / Е. Г. Андрэева, Л. М. Лыч // Беларускі гістарычны часопіс. – 2004. – № 3. – С. 40–47.

**(Дата падачы: 11.02.2022 г.)**

*І. І. Сацукевіч*
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, Мінск

*I. Satsukevitch*
Belarusian State Economic University, Minsk

**УДК 94 (476-25) «1917/1944»**

# АДЛЮСТРАВАННЕГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАГАЖЫЦЦЯ Ў НАЗВАХ ПРАДМЕСЦЯЎ, УРОЧЫШЧАЎ, ПАСЁЛКАЎ І РАЁНАЎ МІНСКА Ў 1917–1944 ГГ.

# REFLECTION OF SOCIO-POLITICAL LIFE IN THE NAMES OF SUBURBS, TRACTS, SETTLEMENTS AND DISTRICTS OF MINSK IN 1917–1944

*Артыкул прысвечаны даследаванню ўплыву грамадска-палітычнага развіцця БССР на фарміраванне назваў прадмесцяў, урочышчаў, пасёлкаў і раёнаў Мінска ў 1917–1944 гг. Аўтар выдзяляе асноўныя фактары фарміравання ўнутрыгарадскіх найменаванняў. Характарызуюцца важнейшыя прынцыпы найменавання ўрочышчаў, рабочых пасёлкаў, адміністратыўных раёнаў. Аналізуецца стварэнне дзяржавай інстытуцыянальнага механізму фарміравання ўрбананіміі Мінску. Акцэнтуецца ўвага на стварэнні ў 1938 г. першых у гісторыі Мінска адміністратыўна-тэрытарыяльных раёнаў – Варашылаўскага, Сталінскага і Кагановіцкага.*

*Ключавыя словы: грамадска-палітычнае развіццё; дзяржава; урбананімія; прадмесце; урочышча; рабочы пасёлак; адміністратыўны раён; перайменаванне; прынцып; механізм.*

*The article is devoted to the study of the influence of the socio-political development of the BSSR settlements and districts of Minsk in 1917–1944. The author identifies the main factors for the formation of intra-city names. The most important principles of naming tracts, workers' settlements, administrative districts are characterized. The article analyzes the creation by the state of an institutional mechanism for the formation of urbanism in Minsk. Attention is focused on the creation in 1938 of the first administrative-territorial regions in the history of Minsk - Voroshilovsky, Stalinsky and Kaganovichi.*

*Keywords: socio-political development; state; urbanonymy; suburb; tract; workers' settlement; administrative district; renaming; principle; mechanism.*

Перыяд 1917–1944 гг. можна вылучыць у асобны этап развіцця ўрбананіміі Мінска. У гэты час дзяржава не толькі кропкава ўмешвалася ў тапаніміку, як было да 1917 г., але і пачала разглядаць унутрыгарадскія назвы як неад’емную частку дзяржаўнай ідэалогіі і выпрацоўваць пэўную палітыку ў гэтай сферы. Гэта перыяд удасканальвання інстытуцыянальнага механізму фарміравання ўрбананіміі Мінску і знікнення аўтаномнага.

Назвы прадмесцяў і ўрочышчаў (харонімы – назвы тэрытарыяльных аб’ектаў) Мінска пасля рэвалюцый, ваенных падзей і перайменаванняў вуліц і плошчаў 1917–1922 гг. не спазналі кардынальных пераменаў. Гэта можна растлумачыць тым, што яны, у адрозненні ад вуліц і плошчаў, не разглядаліся ўладамі як аб’ект дзяржаўнай палітыкі. Вуліцам і плошчам давалі адрасы, замацаваныя юрыдычна, а прадмесцям і ўрочышчам – не. Хоць яны, як і раней, дапамагалі арыентавацца гараджанам на прасторах Мінска.

Фактычна яны дапаўнялі вуліцы і плошчы, дапамагаючы шукаць той ці іншы адрас на карце горада. Так, у дакументацыі гарадскіх службаў за 1919 г. узгадваліся «жители Архиерейской Слободки Ивановской улицы» [1, арк. 7]. У 1922 г. згодна з дакументамі вуліца Радашкоўская знаходзілася ў Пярэспе [2, арк. 14], Ігуменскі тракт – у Серабранцы [3, арк. 17], а вул. Мацвееўская – ва ўрочышчы Пляшчанка [4, арк. 95]. Невыпадкова ў спісе вуліц і плошчаў Мінска за 1925 г. сярод гадонімаў і агаронімаў можна налічыць 28 урочышчаў, прадмесцяў і фальваркаў горада [5, с. 107–112]. У 1920–1930-я гг. працягвалі існаваць многія харонімы дарэвалюцыйнага перыяду: Альшэва, Антонава, Басіялаўка, Весялоўка, Галубоўка, Грушаўка, Кальварыя, Камароўка, Курасоўшчына, Ляхаўка, Міхалянка, Пляшчанка, Пярэспа, Серабранка, Сенажаны, Старажоўка, Татарская Слабада, Тры Карчмы, Цівалі і інш. Яны пастаянна ўзгадваліся ў перыядычных выданнях, дакументах дзяржаўных устаноў, рэкламе прадукцыі і тавараў [6, с. 4].

Многія з гэтых назваў аказаліся ў рэчышчы сацыяльна-эканамічных пераменаў, якія адбываліся ў тагачасным грамадстве. У Тучынцы быў арганізаваны 2-і савецкі цагельны завод [7, арк. 68]. У 1929 г. па вуліцах горада быў арганізаваны трамвайны рух па маршруце «Таварная – Камароўка», а аўтобусы курсіравалі па маршрутах «Кальварыя – Ляхаўка» і «Серабранка – Старажоўка» [8, арк. 118]. Галоўным у горадзе месцам рэалізацыі ў першую пяцігодку планаў індустрыялізацыі стала Ляхаўка, дзе ў пачатку 1930-х гг. выраслі ТЭЦ-2, «Камунарка», швейная фабрыка імя Н. Крупскай [9, с. 13].

У той час, калі адны найменні дарэвалюцыйных прадмесцяў працягвалі сваё існаванне ва ўмовах сталіцы БССР, то іншыя амаль не ўзгадваліся ў перыёдыцы і дакументах. Так, забытымі аказаліся Добрыя Мыслі, Залатая Горка, Круты Бераг, Раманаўская Слабада, Старая Слабада, Траецкая Гара, Уборкі. Верагодна, гэта адбылося таму, што тэрыторыя дадзе-

ных прадмесцяў мела даўно склаўшуюся забудову з устойлівай вулічнай адрасацыяй і яны не знаходзіліся на ўскраіне горада, а значыць «дапамога» назваў прадмесцяў для арыентацыі ў горадзе ўжо не патрабавалася. Не дарэмнай аказалася і палітыка найменавання дзясяткаў безымянных вуліц і завулкаў у 1928–1933 гг., пасля чаго мінчане ведалі свой дакладны адрас па вуліцы. Да гэтага для арыентацыі ім прыходзілася побач з безымяннай вуліцай узгадваць назву прадмесця.

Калі ў пачатку XX ст. для абазначэння харонімаў выкарыстоўвалі тэрміны «прадмесце» і «урочышча», то ў 1920-я гг. застаўся толькі другі. Найменні прадмесцяў засталіся, але побач з імі перасталі пісаць слова «прадмесце». Напрыклад, у 1923 г. пры выдзяленні ўчастка зямлі пад гарадскія патрэбы пазначалася, што ён знаходзіцца «в Кошарах» [10, арк. 99-адв]. Ці былыя прадмесці сталі называць урочышчамі. Так, калі ў 1919 г. у адным з дакументаў узгадваецца прадмесце Тры Карчмы [11, арк. 230], то пазней гэты раён горада фігуруе выключна як урочышча [12, арк. 1; 13, арк. 32]. Больш таго, у гэты час з’яўляецца яшчэ адзін тэрмін, якім пазначалі прастору жылых кварталаў – пасёлак ці рабочы пасёлак. Так «поселок Козырево» у адным з дакументаў за 1924 г. было названа былое прадмесце Козырава [14, арк. 2]. Але звычайна так пачалі называць новыя жылыя масівы, якія ўзводзіліся ў горадзе. Фактычна новы харонім «пасёлак» прыйшоў на замену старому «прадмесцю». У найменні «рабочы пасёлак» можна заўважыць адлюстраванне палітыкі савецкіх улад па ўзвышэнню ролі пралетарыяту ў жыцці грамадства. Першым рабочым пасёлкам горада стаў Камінтэрн, будаўніцтва якога распачалося ў 1925 г. [15, арк. 110]. Рабочы пасёлак атрымаў назву ў гонар арганізацыі «Камінтэрн» (Камуністычны інтэрнацыянал), якая была створана ў 1919 г. як міжнароднае аб’яднанне камуністычных партый розных краін. Назва-сімвал ніяк не была прывязана да мясцовасці і фактычна з’яўлялася новамодным словам з лексікону савецкіх людзей, якое адлюстроўвала тагачасныя палітычныя рэаліі. Новыя кварталы дамоў для рабочых пас. Камінтэрн размясціліся за прамысловай Ляхаўкай на тэрыторыі ўрочышча Тры Карчмы (цяпер раён вул. Заводскай, Фабрычнай і Судмаліса) [16, арк. 88].

Але вырашэнне жыллёвай праблемы пралетарыяту патрабавала ад гарадскіх уладаў актыўных дзеянняў. У 1926 г. быў пабудаваны рабочы пасёлак Чыгуначнік (каля суч. вул. Брылеўскай). Такую назву рабочы пасёлак атрымаў таму, што жыллё для рабочых Маскоўска-Брэсцкай чыгункі ўзводзіла жылёва-будаўнічае кааператыўнае таварыства «Чыгуначнік» [17, арк. 140–143]. У тым жа годзе для рабочых сталіцы БССР былі пабудаваны рабочыя пасёлак 1 Мая (побач з пл. Парыжскай Камуны) і Чырвоны заходнік (дакладна лакалізаваць яго на карце Мінска пакуль не ўдалося) [18, арк. 93]. У 1927 г. будаваліся жылыя дамы ў пасёлках: Друкар (зараз раён вул. Мельнікайтэ), Хлебнік (ля былых яўрэйскіх

могілак па вул. Калектарнай), 11 Ліпеня (там жа), Медработнік (побач з бальніцай на вул. Леніна), Шпалернік (раён шпалернай фабрыкі), Бетонбуд, Чырвоны Будаўнік, Рабасвета 1, Рабасвета 2 (лакалізацыя апошніх не высветлена) [19, с. 3]. Гэтыя найменні-сімвалы павінны былі дэманстраваць ідэалагічную накіраванасць грамадства і размах сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР у 1920-я гг. Заўважым, што рэальнасць была не такой: амаль усе вышэйпералічыныя пасёлкі складаліся з некалькіх – 2-, радзей 4-кватэрных аднапавярховых драўляных дамоў – і вырашыць жыллёвую праблему для рабочых у растучай сталіцы БССР не маглі, стаць трывалымі арыенцірамі для гараджан у Мінску таксама. Разам з тым некаторыя рабочыя пасёлкі атрымоўвалі не толькі сімвалічныя назвы. Так, новы жылы масіў на заходняй ускраіне Мінска атрымаў імя суседняга з ім дарэвалюцыйнага прадмесця Грушаўкі і стаў пасёлкам Грушаўскім. На іншым ускрайку горада непадалёк ад вул. Пушкінскай з'явіліся кварталы пасёлка Пушкінскага (зараз раён вул. Сурганава, Кузьмы Чорнага і Якуба Коласа) [20, с. 68].

Але не толькі новыя рабочыя пасёлкі выраталі ў Мінску ў 1920–1930-я гг. Праблему забеспячэння горада харчаваннем вырашылі ў 1923 г. далучэннем да Мінска навакольных тэрыторый і падпарадкаваннем сельска-гаспадарчых прадпрыемстваў. НЭП патрабаваў збліжэння горада і вёскі. У новую гарадскую рысу ўвайшлі тэрыторыі былых памешчыцкіх сядзібаў, вёсак, палёў і лугоў [21, с. 4]. Новыя ўрбанонімы Мінска называлі ўрочышчамі, хутарамі і вёскамі.

У 1923 г. у межах горада ўпамінаюцца ўрочышчы Жданаўка (зараз Ждановічы) і Шапіраўка (мікрараён Радужны насупраць Мінск-Арэны) [22, арк. 305-адв]. У 1924 г. была праведзена адміністратыўна-тэрытарыяльная рэформа БССР, у выніку якой была створана Менская акруга і на тэрыторыі горада аказаліся два сельсавета: Азярышча-Сляпянскі і Пятроўшчынскі. На тэрыторыі гэтых сельсаветаў аказаліся населеныя пункты, якія не ўваходзілі ў рысу горада да 1917 г. ці з'явіліся ў 1920-я гг.: урочышча Бараноўшчына (зараз там размешчаны мік-н Захад), урочышча Барсукі (3-і і 4-ы зав. Халмагорскія), урочышча Весялоўка (зараз пл. Дзяржаўнага Сцяга і выставачны комплекс «Белэкспа»), урочышча Галубоўка (мік-н Вяснянка), фальварак Дарава («Арэна-сіці» на праспекце Пераможцаў), урочышча Зялёны Луг (мікрараён Зялёны Луг-7), урочышча Кальварышкі (парк «Дрымлэнд» на вул. Арлоўскай), хутар Падгор'е (раён вул. Тыражнай і Гало), хутар Хмарынскія Пасекі (тэрыторыя паміж вул. Нававіленскай і дачамі ў Драздах) [23, арк. 9–11-адв]. У 1927 г. упершыню з'явіліся на карце Мінска ўрочышча Дразды, Ліпкі (суч. мік-н Сцяпянка), Марусіна (месца ля скрыжавання суч. вул. Падольскай і Алешава) [24, арк. 159]. У горадзе з'явіліся новыя харонімы, якія дапамагалі арыентавацца міліцыі і падатковай інспекцыі ў прыгарадных гаспадарках і хутарах. Праўда, далёка не адразу нават міліцыя магла знайсці неабходны адрас

у межах новай рысы горада. Так, у 1924 г. кіраўніцтва міліцыі звярнулася ў мінакрвыканкам: «по надобности просим сообщить месторасположение урочища Липки и хутора Подгорье быв. Сенницкой волости – по делу о взыскании штрафов за порубку леса» [25, арк. 129]. Заўважым, што ўсе новыя харонімы ўказвалі на мясцовасці, асноўным заняткам насельніцтва якіх была сельская гаспадарка. Абсалютная большасць назваў маюць патранімічнае паходжанне. Напрыклад, Хмарынскія Пасекі беспамылкова ўказваюць на Хмараў – былых уласнікаў дадзенай тэрыторыі, а Дарава – на Вярыга-Дарэўскіх, якім раней належыла сядзіба Веснінка [26, арк. 2]. Зялёны Луг і Падгор'е падкрэсліваюць мясцовую тапаграфію. Харонім Кальварышкі ўласцівы не цэнтральнай, а паўночна-заходняй Беларусі, дзе вялікі ўплыў раней мела літоўская мова. Літаральна Кальварышкі – гэта Малая Кальварыя.

Перайменаванняў харонімаў у гэты перыяд зафіксавана мала. Гэта можна растлумачыць тым, што назвы прадмесцяў і ўрочышчаў, у адрозненні ад вуліц і плошчаў, не мелі шыльдаў на мясцовасці і не былі замацаваны дакументальна, а існавалі амаль выключна ў свядомасці гараджан. Тым не менш такія спробы былі. Напрыклад, 10 чэрвеня 1922 г. газета «Звезда» паведаміла, што «горисполком постановил переименовать Ляховку в улицу Лекерта» [27, с. 4]. На тэрыторыі прадмесця Ляхаўка існавала чатыры вуліцы з падобнай назвай: тры Ніжне-Ляхаўскія і Ляхаўская Слабодка. У 1923 г. часта пісалі такім чынам: «Ляховка ныне Лекерта, Ляховка ныне Кожевенная» [28, арк. 61]. Аднак змяніць імя аднаму з найвялікшых прадмесцяў горада аказалася не так проста: тысячы гараджан актыўна карысталіся гэтай назвай. У выніку ўлады абмежаваліся перайменаваннем чатырох Ляхаўскіх вуліц, а назва прадмесця, як і раней, заставалася ў свядомасці і побыце мінчан [29, арк. 12].

Больш паспяховым стала перайменаванне ў 1924 г. прадмесця Архірэйская Слабада і ўрочышча Архірэйскі Гай у адпаведна вул. Пуліхава і ўрочышча Чырвоны Гай [30, с. 3]. У адрозненне ад Ляхаўкі, Архірэйская Слабада была невялікім прадмесцем: у ім не было значных для горада аб'ектаў і яно складалася толькі з адной вялікай аднаіменнай вуліцы. Таму пераход ад Архірэйскай Слабады да Пуліхавай Слабады (менавіта так часта называлі гэты раён у 1920-х гг.) адбыўся хутка [31, с. 93]. Архірэйскім Гаем, Архірэйскім Урочышчам, Архірэйскай Пустынню (зараз вялікая прастора паміж трактарным і аўтамабільным заводамі) называлі гарадскі лес, які да Кастрычніцкай рэвалюцыі быў уласнасцю праваслаўнай царквы. Пасля перайменавання гэтую мясцовасць называлі Чырвоным Гаем ці Чырвоным Урочышчам. У 1929 г. у Чырвоным Урочышчы адкрылі ваенны лагер Чырвонай Арміі [32, арк. 46]. Няма сумненняў, што гэтыя харонімы былі зменены з-за свайго рэлігійнага зместу.

У 1924 г. гарадскія ўлады разглядалі магчымасць перайменавання станцыі і пасёлка Козырава ў Гая – у гонар Г. Гая (сапр. Гайк Бжышкянц), камкора ў савецка-польскую вайну, які з 1923 г. узначальваў 7-ю Самарскую кавалерыйскую дывізію ў Мінску, а з 1924 г. увайшоў у склад ЦВК БССР [33, с. 81]. Але камдзіў не атрымаў прыжыццёвую назву ў Мінску – праект пастановы аб перайменаванні быў закрэслены старшынёй мінакрвыканкама С. Яцкевічам [34, арк. 206]. Па якой прычыне перайменаване не адбылося, можна толькі здагадвацца. А вось чаму планавалі перайменаваць менавіта пасёлак і станцыю Козырава (цяпер Мінск-Паўднёвы) – відавочна. Па-першае, з-за дваранскага паходжання інжынера Дз. Козырава, па прозвішчу якога пайшла іх назва. Па-другое, таму, што 7-я Самарская кавалерыйская дывізія дыслакавалася менавіта ў Козыраве (зараз казармы МУС РБ па вул. Маякоўскага). Перайменаванне Козырава ўсё-такі адбылося ў 1935 г., калі пастановай прэзідыума ЦВК БССР яго назвалі пасёлкам Фрунзэ – у гонар іншага камдзіва М. Фрунзэ [35, с. 3]. Праўда, гэтае перайменаванне так да канца і не было даведзена: гэтаму перашкодзіла кансерватыўнасць гараджан, якія працягвалі карыстацца ранейшай назвай, і Вялікая Айчынная вайна.

У губернскім Мінску ў пач. ХХ ст. тэрыторыя горада для зручнасці збору падаткаў і работы паліцыі была падзелена на пяць паліцэйскіх частак [36, с. 12]. У 1923 г. па гэтай жа прычыне гарадская прастора складалася з чатырох міліцэйскіх раёнаў [37, арк. 154]. Аднак з пункту гледжання арыентацыі ў гарадской прасторы выкарыстанне такіх абазначэнняў (1-ы, 2-і, 3-і, 4-ы міліцэйскі) для раёнаў было нязручным. Таму часта ў дакументах і газетах іх называлі па-іншаму. Напрыклад, у 1927 г. так тлумачылася адно з рашэнняў прэзідыума мінакрсавета: «дзеля абслугоўвання працоўных мас Ляхаўскага і Серебранскага раёнаў» [38, арк. 41]. Відавочна, што пад Ляхаўскім разумеўся 1-ы міліцэйскі раён, а пад Серабранскім – 3-і міліцэйскі раён (куды акрамя тагачаснай Серабранкі ўваходзіла тэрыторыя вакол абодвух чыгуначных вакзалаў і пас. Грушаўскі). Камароўскім называлі 2-і (паўночна-ўсходняя частка Мінска), а Татарскім – 3-і (паўночна-заходняя) міліцэйскі раён. Заўважым, што для абазначэння міліцэйскіх раёнаў у 1927 г. (час правядзення беларусізацыі) былі абраны назвы прадмесцяў – Ляхаўкі, Серабранкі, Камароўкі, Татарскай Слабады, – якія былі найбольш значнымі аб’ектамі на іх тэрыторыі.

Здавалася, усё ішло да стварэння адміністратыўных раёнаў горада. 3 мая 1928 г. адбылося пасяджэнне мінакрвыканкаму, на якім разглядалася пытанне аб утварэнні раённых саветаў у Мінску. Захаваўся пратакол гэтага пасяджэння, у рэзалюцыі якога старшыня мінакрвыканкаму С. Яцкевіч вымушаны быў прызнаць: «прымаючы пад увагу, што ў сучасную пару немагчыма забяспечыць райсавет самастойным бюджэтам і такім чынам увесці пад іх працу матэрыяльную базу, утварэнне іх лічыць папярэднечасовым» [39, арк. 250]. Пытанне аб стварэнні адміністратыўных раёнаў у Мінску было

адкладзена на 10 гадоў. Пастановай прэзідыума ЦВК БССР ад 15 сакавіка 1938 г. у горадзе былі арганізаваны 3 раёны: Сталінскі, Варашылаўскі і Кагановіцкі [40, с. 349]. Імёны гэтыя адміністратыўныя адзінкі атрымалі ў гонар жывых лідараў партыі бальшавікоў і Савецкай дзяржавы – І. Сталіна, К. Варашылава, Л. Кагановіча. Менавіта раёны сталі ў ХХ ст. харонімамі, якім не пагражала знікненне, паколькі яны існавалі не толькі юрыдычна, але і прысутнічалі амаль ва ўсіх сферах гарадскога жыцця.

Такім чынам, у 1917–1944 гг. харонімы заставаліся важнай часткай урбананімнай прасторы Мінска. Пры гэтым яны не падвергліся масавым перайменаванням, як гэта адбылося з назвамі вуліц і плошчаў. Большая частка прадмесцяў і ўрочышчаў папярэдняга перыяду працягвала існаваць і ў гэты час. У 1920-я гг. з'явілася новае абазначэнне для хароніма – рабочы пасёлак, – якое паступова выціснула з абіходу панаваўшае ў папярэдні перыяд прадмесце. Новыя харонімы ў 1920-я гг. (час НЭПа і беларусізацыі) атрымоўвалі назвы, якія падкрэслівалі камуністычную ідэалогію, мясцовую тапаграфію, развіццё прамысловасці і асабліва сельскай гаспадаркі. А вось з сярэдзіны 30-х гг. стала праяўляцца тэндэнцыя да найменавання харонімаў у гонар персаналій з савецкай найноўшай гісторыі. Харонімы фарміраваліся ў першую чаргу пад уплавам грамадска-палітычнага фактару. У 1917–1944 гг. інстытуцыянальны механізм фарміравання ўрбананімнай прасторы Мінска, які ў гэты час паставіў пад кантроль назвы вуліц і плошчаў, у дачыненні да харонімаў паказаў нізкую эфектыўнасць, за выключэннем адміністратыўных раёнаў. У 1938 г. тэрыторыя Мінска была падзелена на тры адміністратыўныя раёны – Варашылаўскі, Кагановіцкі і Сталінскі.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці (ДАМВ). – Ф. 354. Воп. 2. Спр. 196.
2. ДАМВ. – Ф. 354. Воп. 2. Спр. 85.
3. ДАМВ. – Ф. 354. Воп. 2. Спр. 78.
4. ДАМВ. – Ф. 354. Воп. 2. Спр. 346.
5. Вся Белоруссия. Справочная книга на 1925 г. – Минск, 1925.
6. Звезда. – 1922. – 18 фев.
7. ДАМВ. – Ф. 1111. Воп. 1. Спр. 18. Арк. 68.
8. ДАМВ. – Ф. 6. Воп. 1. Спр. 211.
9. Мінск незнаёмы: 1920–1940 / Аўт.-уклад. І. Куркоў. – Мінск: Ураджай, 2002.
10. НАРБ. – Ф. 34. Воп. 1. Спр. 360.
11. ДАМВ. – Ф. 1111. Воп. 1. Спр. 17.
12. ДАМВ. – Ф. 354. Воп. 2. Спр. 432.
13. ДАМВ. – Ф. 6. Воп. 1. Спр. 109.
14. ДАМВ. – Ф. 354. Воп. 2. Спр. 258.

15. НАРБ. – Ф. 6. Воп. 1. Спр. 540.
16. ДАМВ. – Ф. 6. Воп. 1. Спр. 110.
17. ДАМВ. – Ф. 3. Воп. 1. Спр. 126.
18. НАРБ. – Ф. 18. Воп. 1. Спр. 243.
19. *Кулькин.* Новые дома трудящимся / Кулькин // Рабочий. – 1927. – 6 августа.
20. *Тарас, В.* На высьпе ўспамінаў / В. Тарас. – Вільня: Ін-т беларусістыкі, 2007.
21. Расширение черты города Минска // Звезда. – 1923. – 19 мая.
22. ДАМВ. – Ф. 3. Воп. 1. Спр. 17.
23. ДАМВ. – Ф. 3. Воп. 1. Спр. 239.
24. ДАМВ. – Ф. 6. Воп. 1. Спр. 141.
25. ДАМВ. – Ф. 3. Воп. 1. Спр. 17.
26. НГАБ. – Ф. 1. Воп. 1. Спр. 2297.
27. Звезда. – 1922. – 10 июня.
28. ДАМВ. – Ф. 354. Воп. 1. Спр. 80.
29. ДАМВ. – Ф. 6. Воп. 1. Спр. 226.
30. Звезда. – 1923. – 3 июня.
31. Уся БССР. Менск, 1935.
32. ДАМВ. – Ф. 6. Воп. 1. Спр. 211.
33. Их именами названы… Улицы Минска: энцикл. справ. / редкол.: В. В. Андриевич (гл. ред.) [и др.]. – Минск: Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2014.
34. ДАМВ. – Ф. 3. Воп. 1. Спр. 47.
35. Рабочий. – 1935. – 23 фев.
36. *Шыбека, З. В.* Старонкі жыцця дарэвалюцыйнага горада / З. В. Шыбека, С. Ф. Шыбека; пер. з рус. мовы М. Віжа; прадм. С. М. Станюты. – Мінск: Полымя, 1994.
37. ДАМВ. – Ф. 3. Воп. 1. Спр. 78.
38. ДАМВ. – Ф. 6. Воп. 1. Спр. 141.
39. ДАМВ. – Ф. 6. Воп. 1. Спр. 141.
40. Минск: Энцикл. справочник / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – 2-е изд., доп., перераб. – Минск: Бел. Сов. Энциклопедия, 1983.

**(Дата падачы: 25.02.2022 г.)**